*Гатальская, К.Г.* Асноўный крыніцы высокай смяротнасці ў сярэднія вякі / К.Г. Гатальская // Лістападаўскія сустрэчы – 5. Праблемы старажытнасці і сярэднявечча: Зборнік артыкулаў па матэрыялах Міжнароднай навуковай канферэнцыі ў гонар акадэмікаў М. М. Нікольскага і У. М. Перцава (13–14 лістапада 2003 г., Мінск) / Навук. рэд. В. А. Фядосік і І. А. Еўтухоў. — Мн.: БДУ, 2005. — С. 157–159.

***К. Г. Гатальская***

# АСНОЎНЫЙ КРЫНІЦЫ ВЫСОКАЙ СМЯРОТНАСЦІ Ў СЯРЭДНІЯ ВЯКІ

У сярэднявеччы насельніцтва Еўропы не магло развівацца раўнамерна, без значных ваганняў, у якасці адной з прычын якіх выступалі рэзкія скачкі з павышэннем узроўню смяротнасці, сярод галоўных крыніц якой можна вылучыць тры асноў-ныя: голад, эпідэміі і войны.

Жак Ле Гоф назваў увесь сярэднявечны Захад «універсумам голаду, бо яго мучыў жах голаду і занадта часта сам голад». Недахоп ежы быў абумоўлены некалькімі фактарамі. Па-першае, ваганнямі ўраджайнасці з-за недасканалых сельскагаспадарчых тэхналогій. Па-другое, дрэнна наладжанымі гандлёвымі сувязямі, якія не дазвалялі ажыццяўляць пастаўкі збожжа ва ўсе неўраджайныя раёны. Па-трэцяе, ненадзейнымі спосабамі захоўвання прадуктаў. Увесь гэты комплекс умоў часта прыводзіў ад неўраджаю да голаду, які выклікаў значную смяротнасць, стрымліваў рост насельніцтва.



Пра перыяд пачатку XI ст. засталіся сведчанні ў Рауля (Радульфа) Глабера: «У 1027 г. зямлю пачаў спусташаць голад, і род чалавечы быў пад пагрозай хуткага разбурэння... Паміраючых было так многа, што іх не паспявалі хаваць». Часта галодныя гады суправаджаліся канібалізмам, які мог прымаць памеры сапраўднага палявання на людзей, калі здабычай моцных станавіліся слабыя і хворыя. Глабер працягвае апісанне голаду: «Падарожнік, пацярпеўшы напад на дарозе, падаў пад ударамі забойц, яны разрывалі яго члены на часткі, смажылі іх і пажыралі. Іншыя былі прыняты ў дамах, а гаспадары душылі іх уначы, каб пасля з’есці. Некаторыя паказвалі дзеткам фрукт ці яйка, заманьвалі іх у бок і пажыралі».

Звычайна эпідэміі ішлі побач з голадам, але ў значнай масе летапісных крыніц усе яны праходзяць пад адзінай назвай «мор», таму цяжка ідэнтыфікаваць іх. Найболын жорсткімі былі эпідэміі чумы, якія паўтараліся, прыкладна, кожныя 10 год і цягнуліся некалькі гадоў запар. Напрыклад, з 1326 по 1400 г. у Германіі налічвалася 32 гады эпідэмій, з 1400 па 1500 — каля 40[1]. Таксама і ўплыў войнаў на дэмаграфічныя працэсы быў вялікім заўсёды, бо яны зніжаюць прырост насельніцтва, маюць значную колькасць ахвяр. Страты ад вайны нясе не толькі армія, але і грамадзянскае насельніцтва з прычыны павышэння смяротнаеці і паніжэння нараджальнасці. На прыкладзе Францыі і Англіі можна прасачыць, як спалучэнне мацнейшай эпідэміі чумы, ці «Чорнай смерці» (1347—1352), Стогадовай вайны (1337—1453) і шэрага сялянскіх паўстанняў (Жакерыя ў Францыі 1358 г., паўстанне Уота Тайлера ў Англіі 1381 г.) знізілі колькасць насельніцтва. Паводле даных па колькасці ачагоў у акругах Бокэр і Нім (Францыя), заўважана, як няўхільна паступова скарачалася насельніцтва ў

час ваенных дзеянняў і які моцны скачок быў зроблены ў перыяд эпідэміі «Чорнай смерці»:

| Гады | Колькасць ачагоў |
|---|---|
| 1328 | 102 268 |
| напярэдадні 1345 | 92 017 |
| 1345 | 75 783 |
| каля 1370 | 22 637 |
| 1387 | 7 382 |

---

[1] *Урланис Б.Ц.* Рост населения в Европе. Опыт исчисления. М., 1941. С. 32. Табліцы складзены паводле гэтага выдання.



Гэтыя даныя можна параўнадь з дынамікай росту насельніцтва Англіі ў той жа перыяд XIV ст. З табліцы бачна, што колькасць насельніцтва ў Англіі скарачалася ў асноўным з-за эпідэміі, як гэта было пасля навалы «Чорнай смерці», а не вайны, бо болыпасць актыўных дзеянняў вялася на тэрыторыі Францыі. З табліцы бачна, што за стагоддзе колькасць насельніцтва Англіі не ўзрасла.

| Гады | Насельніцтва (у тыс.) |
|---|---|
| 1300 | 2800 |
| 1327 | 3000 |
| 1348 | 3300 |
| 1350 | 2300 |
| 1377 | 2700 |
| 1400 | 2800 |

Дынаміка развіцця насельніцтва Заходняй Еўропы была вельмі нестабільнай, з прычыны безабароннасці грамадства перад прыроднымі і штучнымі «катастрофамі» — голадам, эпідэміямі, войнамі.